Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 КАСТРЫЧНІКА 2016 г. АЎТОРАК № 196 (28306)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Што здарылася ў «Еўропе»?**

СТАР. 3

СОЮЗ ЕВРАЗИЯ



**Як пашырыць транзіт**



**Самая развітая краіна Афрыкі**

СТАР. 13

# ЛАВІСЯ, ЯГАДКА!

**Прадпрыемства «Палескія журавіны» з'яўляецца самай буйной гаспадаркай, якая займаецца вырошчваннем журавін у Еўропе. Яе плошча складае 82 га. Сабраныя журавіны дзеляцца на два класы — «А» і «Б» у залежнасці ад таго, якім метадам ажыццяўлялася ўборка: мокрым або сухім. Летась у гаспадарцы была сабрана рэкордная колькасць журавін за ўсю гісторыю плантацыі — 665 тон. На сённяшні дзень сабрана каля 150 тон з меркаваных 500.**



Работнік гаспадаркі «Палескія журавіны» Віталь Садуха ў час уборкі мокрым метадам.



Фота БЕЛТА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір АМАРЫН, міністр фінансаў:**

*«Праект бюджэту краіны на наступны год сфарміраваны з улікам неабходнасці забеспячэння макраэканамічнай стабільнасці і стварэння ўмоў для наступнага эканамічнага росту. У аснове бюджэту кансерватыўны прагноз па тэмпах эканамічнага росту — 100,2%. Гэта надае бюджэту рэальны збалансаваны характар. Калі і будзем удакладняць бюджэт, то ў сувязі з перавыкананнем даходнай часткі і накіраваннем дадатковых выдаткаў на тыя патрэбы, якія ў нас узнікнуць».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.10.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9137 ▼ | |
| Еўра | 2,1391 ▲ | |
| Рас. руб. | 0,0306 ▼ | |
| Укр. грыўня | 0,0740 ▼ | |

ISSN 1990 - 763X

■ Першае інтэрв'ю на новай пасадзе

## Галоўны герой — музейны прадмет

### І сучасныя тэхналогіі, на думку новага дырэктара Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, яго ніколі не заменяць

**Кабінет многае можа сказаць пра яго гаспадара. У кансерватыўнай абстаноўцы офіса новага дырэктара Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ёсць тое, што выбіваецца з агульнай канцэпцыі інтэр'ера. На сцяне, побач са сціплым дыпломам, уручаным некалі Дзмітрыю ШЛЯХЦІНУ высокім чыноўнікам, вісіць вялікая рамка. За шклом — чорна-белыя фотаздымкі, узнагародныя лісты. Гэта сямейная спадчына Шляхціных, пакінутая дзедам, ветэранам Вялікай Айчыннай вайны. Такім чынам захаванне памяці ў музеі пачынаецца з кабінета дырэктара. Адсюль — і першае пытанне.**

***— Вялікая Айчынная вайна, за рэдкім выключэннем, закранула кожную беларускую сям'ю. Бачу, што і ў вашым радаводзе былі тыя, пра каго варта расказаць калі не ў музейнай экспазіцыі, дык хоць бы на старонках газеты «Звязда»...***



— Мой дзядуля па матчынай лініі, Мікалай Іванавіч Пятроў, у Чырвоную Армію быў прызваны ў 1944 годзе, таму застаў аснойныя баі па вызваленні Еўропы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Вызваляў Варшаву, удзельнічаў у Вісла-Одэрскай і Берлінскай аперацыях. Падчас апошняй быў паранены, на чым яго баявы шлях скончыўся. Сёння мы беражліва захоўваем дзядулевы ўзнагароды: ордэны Айчыннай вайны I і II ступеняў, ордэн Чырвонай Зоркі, медалі "За баявыя заслугі", «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна», «За Перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.». Бабуля мая, Любоў Сямёнаўна Пятрова, не ваявала, але ўсю вайну пражыла на акупаванай тэрыторыі.

СТАР. 4

■ Надвор'е

## ХОЛАД З АРКТЫКІ

### Сярэднясутачная тэмпература паветра на гэтым тыдні будзе на 2—3 градусы ніжэй за норму

**Паветраныя масы з поўначы кантынента прынясуць пахаладанне ў Беларусь, паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

Такім чынам, на гэтым тыдні на змену дажджам прыйдзе сур'ёзнае пахаладанне, калі на тэрыторыі краіны пачне гаспадарыць скандынаўскі антыцыклон. Дажджоў стане значна менш, а ўначы паўсюдна будуць замаразкі. Паводле слоў Дзмітрыя Рабава, вецер, вільготнасць і халоднае паветра з Арктыкі ствараць адчуванне вельмі халоднага надвор'я глыбокай восені, якая запатрабуе больш цёплых прадметаў гардэроба.

У аўторак удзень па поўдні краіны пройдуць дажджы. Максімальная тэмпература паветра складзе ўсяго 5—10 цяпла. Ужо ў сераду будзе пераважна без ападкаў, толькі ноччу і раніцай па паўднёвым захадзе краіны пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. Менавіта з сярэдзіны тыдня на тэрыторыі Беларусі будзе гаспадарыць надвор'е, якое звычайна адпавядае другой палове лістапада. Тэмпература паветра ўначы на сераду складзе 1—7 цяпла, а па паўночным ўсходзе чакаюцца замаразкі да нуля — мінус 4 градусаў. Удзень таксама будзе не вельмі камфортна — плюс 4—9 градусаў. Сіноптыкі прагназуюць, што ў чацвер ападкаў не будзе ўвогуле. Уначы амаль паўсюдна чакаюцца замаразкі ад нуля да мінус 4 градусаў, у асобных раёнах тэмпература паветра складзе 1—4 цяпла. Удзень — плюс 4—9 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў з пятніцы па нядзелю будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы туман, а месцамі — нават слабы галалёд. Уначы на большай частцы тэрыторыі Беларусі чакаюцца замаразкі да мінус 4 градусаў, але ў асобных раёнах тэмпература паветра складзе ад 1 да 4 цяпла. Удзень будзе ўсяго плюс 2—9 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*